# ЗЯРНЯТКА 34

29 красавіка 2018 г., V Вялікодная нядзеля, год В

*Хто застаецца ўва Мне, а Я ў ім, той прыносіць багаты плён* Ян 15, 1-8



Езус сказаў сваім вучням: Я — сапраўдная вінаградная лаза, а Айцец Мой — вінаградар. Кожную галінку ўва Мне, якая не прыносіць плоду, Ён адразае, і кожную, якая дае плод, ён ачышчае, каб давала яшчэ больш пладоў. Вы ўжо чыстыя дзякуючы слову, якое Я сказаў вам. Заставайцеся ўва Мне, а Я ў вас. Як галінка не можа прынесці плоду сама з сябе, калі не застанецца ў вінаграднай лазе, так і вы, калі не будзеце ўва Мне.

Я — вінаградная лаза, вы — галіны. Хто застаецца ўва Мне, а Я ў ім, той прыносіць багаты плён, бо без Мяне нічога не можаце зрабіць. Хто не застаецца ўва Мне, будзе выкінуты вон, як галіна, і засохне. І збіраюць іх, і кідаюць у агонь, і яна згарае. Калі будзеце ўва Мне і словы Мае ў вас будуць, прасіце, чаго захочаце, і станецца вам. Гэтым уславіцца Айцец Мой, калі вы прынясеце багаты плён і станеце Маімі вучнямі.



*Гэта слова Пана.*

**Цябе, Пане, я праслаўлю на вялікім сходзе.**



# Прайдзі лабірынт.







**Малітва.**

Пане Езу, Ты сапраўдная вінаградная лаза, а я-твая галінка. Дзякую за дар Тваёй ахвярнай любові , учыні каб я прыносіў добры плён ў сваім жыцці. Амэн.